Гаўрылаў І.

# СМЕЛЫ КУЛЯМЁТЧЫК

НАШ ЗЯМЛЯК Аляксандр Нікіфаравіч Варанцоў нарадзіўся ў 1907 годзе ў вёсцы Панькаўская Буда Баронькаўскага сельсавета. Пасля заканчэння Баронькаўскай пачатковай школы ён працаваў у сельскай гаспадарцы, а калі пачалася Вялікая Айчынная вайна, то ў першы ж месяц Аляĸандр Нікіфаравіч пайшоў на фронт. У хуткасці ён авалодаў спецыяльнасцю наводчыка станкавага кулямёта і выдатна змагаўся ў радах 59-га гвардзейскага кавалерыйскага палка 17-й гвардзейскай кавалерыйскай дывізіі. Радавы Варанцоў удзельнічаў ва ўсіх баявых аперацыях і рэйдах, якія здзейсніў полк па глыбокіх варожых тылах праціўніка.

Камандаванне палка хутка заўважыла ў Аляксандра Нікіфаравіча выдатныя якасці адважнага кулямётчыка. У 1942–1943 гадах Аляксандр Нікіфаравіч удзельнічаў у гераічным 42-дзённым рэйдзе па тылах праціўніка на ўчастках Ржэў – Сычоўка – Нелідаў. Асабліва праявіў сябе смелы кулямётчык у баях пад Сычоўкай, калі іх эскадрон трапіў пад моцны мінамётна-артылерыйскі агонь. Нягледзячы на ўраганны агонь ворага, эскадрон усё ж перайшоў у контратаку.

Гвардзеец Варанцоў пераадолеў паласу агню, выкаціў кулямёт на адкрытую пазіцыю і трапнымі чэргамі адбіў першую атаку. Вораг выявіў кулямёт Варанцова і адкрыў па ім мінамётны агонь. Выбухам міны Варанцоў быў кантужан, але працягваў весці агонь па ворагу і адбіў яшчэ тры контратакі. Пад прыкрыццём агню яго кулямёта эскадрон уварваўся ў вёску Сычоўка.

У верасні 1943 года ў складзе войск Бранскага фронта кулямётчык Варанцоў першым фарсіраваў раку Дзясну і на супрацьлеглым берагу забяспечыў паспяховую пераправу эскадрона праз раку. У гэтым баю Аляксандр Нікіфаравіч знішчыў 15 нямецкіх салдат.

У Мозырска – Калінкавіцкай аперацыі чырвонаармеец Варанцоў прыкрываў агнём свайго кулямёта баявыя дзеянні эскадрона. У трохдзённым упартым баі за Сядлец ён дзейнічаў смела і адважна. Знішчыў два кулямёты праціўніка і 18 фашыстаў, чым забяспечыў прасоўванне эскадрона без страт.

У баю за горад Бромбер эскадрон, уварваўшыся ў горад, быў адрэзан пераўзыходзячымі сіламі праціўніка. І тут кулямёт Варанцова сыграў выключную ролю ў адбіцці контратак гітлераўцаў. Устаноўлены на вуглу дома, нягледзячы на абстрэл яго пазіцыі з самаходных гармат немцаў, ён трымаў пад агнём вуліцы і не даваў праходу фашыстам. У гэтым баю Варанцоў знішчыў звыш 70 варожых салдат і сваёй стойкасцю і храбрасцю, бездакорнай работай кулямёта выратаваў эскадрон ад вялікіх страт.

Аляксандр Нікіфаравіч у баях за горад Бервальдзе атрымаў баявую задачу: разам з другімі кулямётчыкамі эскадрона авалодаць шашою і перарэзаць чыгунку. Аднак на іх шляху аказалася вялікая перашкода – апорны пункт праціўніка пад назвай "панскі двор".Трэба было ліквідаваць яго. Смелы гвардзеец, нягледзячы на вялікую небяспеку, пераадолеў агнявую паласу ворага, перарэзаў чыгунку, выйшаў на шашу і адкрыў ураганны агонь. з кулямёта. Гэтым самым ён прыкрыў шлях эскадрону, які затым поўнасцю выбіў немцаў з апорнага пункта і асядлаў шашу.

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 31 мая 1945 года за баявыя подзвігі Аляксандру Нікіфаравічу Варанцову прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

**Гаўрылаў, І. Смелы кулямётчык / І. Гаўрылаў // Сцяг камунізма (Касцюковічы). — 1965. — 9 мая. — С. 3.**